Дыяцэзіяльная перэгрынацыя фігуры Маці Божай Фацімскай

Аўтар: Ангеліна Пакачайла, фота ave-maria.by
07.05.2017 00:00



Урачыстая падзея распачнецца акурат у 100-ую гадавіну аб’яўленняў Нябеснай Каралевы ў Партугаліі. “Мы зноў будзем мець магчымасць узгадаць змест фацімскага паслання, каб узмацніць нашу барацьбу са злом і наблізіць трыумф Беззаганнага Сэрца Марыі”, – зазначае ў паведамленні на дыяцэзіяльную перэгрынацыю фігуры Маці Божай біскуп Гродзенскі Аляксандр Кашкевіч. Водгалас мінулага

Першая перэгрынацыя фігуры Маці Божай Фацімскай у Беларусі была прысвечана 80-годдзю аб’яўленняў Марыі ў Партугаліі. Спецыяльна да юбілею кардынал Казімір Свёнтэк асвяціў і прывёз з фацімскай зямлі фігуру Маці Божай, якая з мая 1997 года па верасень 1998 года пілігрымавала па касцёлах і капліцах Беларусі.

Перад перэгрынацыяй вернікі краіны рыхтаваліся да прыняцця фігуры Марыі праз місіі і рэкалекцыі, пазнаючы змест і сутнасць фацімскага паслання. † Непасрэдна самі дні наведвання фігуры ў парафіяльных супольнасцях былі звязаны з моцнымі перажываннямі, якія ўносілі святло і надзею ў людскія сэрцы. Вернікі ўшаноўвалі Маці Божую праз дзённае і начное малітоўнае чуванне, св. Імшу, Камунію, працэсію са свечкамі. Па словах ардынарыя Гродзенскай дыяцэзіі біскупа Аляксандра Кашкевіча, “гэта быў час Матчыных указанняў і перасцярог для заблукалых, суцяшэння і ўмацавання для слабых і яўпэўненых”.

У экуменічным духу

Урачыстае распачацце дыяцэзіяльнай перэгрынацыі да 100-годдзя аб’яўленняў Мар

10.00	– канферэнцыя на тэму “Актуальнасць культу Маці
11.00	– адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту;
12.00	– св. Імша з асвячэннем фігуры Маці Божай Фацімс

Аўтар: Ангеліна Пакачайла, фота ave-maria.by
07.05.2017 00:00

Запрашаюцца святары, манахі і манахіні, а таксама вернікі дыяцэзіі.



На пачатку перэгрынацыі кардынал Казімір Свёнтэк заўважыў: “Я перакананы, што гэтая пілігрымка Маці Божай Фацімскай у Яе фігуры ажывіць рэлігійнае жыццё краю, наблізіць людзей да Бога і паспрыяе збліжэнню ўсіх веравызнанняў”.

І сапраўды. Да ўшанавання Маці Божай вельмі часта далучаліся вернікі праваслаўнай Царквы. “На мяжы парафіі Міжэрычы, у вёсцы Аляксандраўшчына (Слонімскі дэканат – заўв. аўт.), дзе ў большасці жывуць праваслаўныя, людзі выслалі дыван з кветак плошчай 50 метраў і паставілі алтар, пры якім адбыўся не прадугледжаны праграмай паўгадзінны прыпынак, – успамінае а. Ян Банькоўскі OFMCap. – Вернікі са слязамі на вачах маліліся і спявалі праваслаўныя марыйныя песні. У самім касцёле ў Міжэрычах падчас адарацыі была рызначана спецыяльная гадзіна малітвы для праваслаўных хрысціян, якія ў вялікай колькасці прыбылі ў святыню. Пазней яны з радасцю неслі фігуру падчас працэсіі, замяняючыся з іншымі групамі вернікаў. На наступны дзень па дарозе ў парафію Дзявяткавічы ў вёсцы Дзергелі праваслаўныя ўсталявалі палявы алтар, на якім была выстаўлена фігура. З пачуццём лыбокай пашаны з ёй развітваліся ўсе вернікі: як католікі, так і праваслаўныя”. У падобнай атмасферы праходзіла перэгрынацыя фігуры Маці Божай Фацімскай ва ўсіх парафіях Беларусі.

Падзея сапраўды насіла выключны характар, так як праваслаўная Царква на афіцыйным узроўні да сённяшняга дня не прызнае аб’яўленні ў Фаціме. Але вера ў заступніцкую моц Маці Божай перад Яе Сынам здолела аб’яднаць шматлікіх вернікаў, незалежна ад анфесійнай прыналежнасці, і нават атэістаў. “Наведванне фігуры Маці Божай сустрэлася з вялікай зацікаўленасцю няверуючых, абыякавых да рэлігіі і вызнаўцаў іншых рэлігій, якія жывуць у нашай парафіі. Можна сказаць, што Марыя сабрала вакол сябе шмат людзей, асабліва пры сваім прывітанні і падчас св. Імшаў на пачатак і развітанне”, – запісана ў памятнай кнізе, якая спадарожнічала фацімскай фігуры ў яе пілігрымцы па Гродзенскай дыяцэзіі, парафіянамі касцёла ў Кемелішках (Астравецкі дэканат).

Трыумф Сэрца Маці Божай

ПРАГРАМА ПЕРЭГРЫНАЦЫІ ФІГУРЫ МАЦІ БОЖАЙ ФАЦІМСКАЙ У ГРОДЗЕНСКАЙ

Аўтар: Ангеліна Пакачайла, фота ave-maria.by
07.05.2017 00:00

13 мая – 26 мая : дэканат ШЧУЧЫН
26 мая – 8 чэрвеня : дэканат РАДУНЬ
8 чэрвеня – 18 чэрвеня : дэканат ІЎЕ
18 чэрвеня – 26 чэрвеня : дэканат АШМЯНЫ
26 чэрвеня – 9 ліпеня : дэканат АСТРАВЕЦ
9 ліпеня – 19 ліпеня : дэканат СМАРГОНЬ
19 ліпеня – 3 жніўня : дэканат ЛІДА
3 жніўня – 10 жніўня : дэканат НАВАГРУДАК
10 жніўня – 17 жніўня : дэканат ДЗЯТЛАВА
17 жніўня – 25 жніўня : дэканат СЛОНІМ
25 жніўня – 2 верасня : дэканат МАСТЫ
2 верасня – 14 верасня : дэканат ВАЎКАВЫСК
14 верасня – 20 верасня : дэканат БЕРАСТАВІЦА
20 верасня – 27 верасня : дэканат САПОЦКІН
27 верасня – 9 кастрычніка : дэканат ГРОДНА-УСХОД
9 кастрычніка – 22 кастрычніка : дэканат ГРОДНА-ЗАХАД

У Гродзенскай дыяцэзіі фігуру Марыі перавозілі з парафіі ў парафію спецыяльным аўтамабілем-капліцай, які арганізаваў бр. Альбін з Супольнасці Братоў Самарыцян з Дзярэчына (Слонімскі дэканат). Пілігрымка доўжылася з чэрвеня па лістапад 1997 года. Затым фігура прабывала ў семінарыйнай і манастырскіх капліцах, гродзенскай катэдры. У маі 1998 года там адбыліся святкаванні, звязаныя з заканчэнем перэгрынацыі ў родзенскай дыяцэзіі, пасля чаго фігура была ўрачыста перададзена ў мінскую архікатэдру. Там адбыўся акт прысвячэння Беларусі Беззаганнаму Сэрцу Маці Божай. “Святая Марыя! – прамовіў кардынал Казімір Свёнтэк. – Аддаю Табе ўсе парафіі, усе святыні, капліцы, усіх святароў і манахаў, увесь гэты верны люд Божы. Будзь поўнай гаспадыняй ва ўсіх святынях і дамах”.

Зараз фігура Маці Божай знаходзіцца ў пінскай катэдры, як напамін аб заўсёды актуальным фацімскім пасланні.

Другое прывітанне Марыі ў фацімскай фігуры

Падчас агульнабеларускай перэгрынацыі ў 1997–1998 гг. Маці Божая ў фацімскай фігуры

Дыяцэзіяльная перэгрынацыя фігуры Маці Божай Фацімскай

Аўтар: Ангеліна Пакачайла, фота ave-maria.by
07.05.2017 00:00

